Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ВЕРАСНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 168 (28278)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ГЭТЫ ДЗЕНЬ — АСАБЛІВЫ

*Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам*

**Дарагія сябры!**

Віншую вас з Днём ведаў.

Гэта свята ўвасабляе непарыўную сувязь пакаленняў, перадачу мудрасці і вопыту ад бацькоў дзецям, ад настаўнікаў — вучням. Ва ўсе часы беларусы цанілі адукаванасць, майстэрства і прафесіяналізм, а сёння менавіта гэтыя якасці з'яўляюцца гарантыяй дабрабыту і ўстойлівага развіцця краіны. Таму мы ўдзяляем вялікую ўвагу захаванню лепшых традыцый айчыннай педагогікі, удасканаленню сістэмы навучання і выхавання падрастаючага пакалення.

У гэтым годзе школьны парог упершыню пераступяць больш за сто тысяч першакласнікаў, новы этап у спасціжэнні навук пачнецца для навучэнцаў і студэнтаў. Няхай час вучобы стане для вас светлым і цікавым, дапаможа рэалізаваць свае здольнасці і набыць месца ў жыцці.

1 верасня — асаблівы дзень для нашых педагогаў. Быць настаўнікам — гэта прызванне і лёс. Ад вашых прафесійных навыкаў і ўзроўню падрыхтоўкі залежаць дасягненні вучняў, а актыўная грамадзянская пазіцыя падкрэслівае ролю настаўніка ў грамадстве.

Жадаю, каб новы навучальны год прынёс усім вам поспехі ў працы і шчыры энтузіязм у асваенні новых ведаў, радасць творчага пошуку, шчасце і дабрабыт.

Са святам!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Валерый КАВАЛЬКОЎ, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Пераразлік працоўных пенсій з улікам росту сярэдняй заработнай платы работнікаў у краіне ў межах сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва будзе праведзены да канца гэтага года».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 24° |
| Віцебск | + 20° |
| Гомель | + 22° |
| Гродна | + 23° |
| Магілёў | + 21° |
| Мінск | + 21° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.09.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9605 | ▲ |
| Еўра | 2,1851 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0300 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0749 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ЛІНЕЙКУ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

31 жніўня, г. Мінск.

## СПРАДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ НАД ДНЯПРОМ

XXIII ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА РАГАЧОЎ 2016

### Святочную сцэну Дня беларускага пісьменства ўпрыгожыць 42-метровае люстэрка з арнаментам

**XXIII Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Рагачове ўжо ў гэтыя выхадныя — 3—4 верасня. Гасцей і ўдзельнікаў свята, а таксама тых, хто сёлета (упершыню) зможа ўбачыць яго па тэлебачанні, чакаюць шматлікія сюрпрызы ад арганізатараў. Можна будзе даведацца пра любімыя кнігі беларускіх адказных асоб і народных артыстаў, пачуць найбольш упадабаныя вершы айчынных тэлевядучых і спевакоў, а таксама пазнаёміцца з беларусамі з 19 краін, якія прыедуць сюды прадстаўляць свае дыяспары.**

— Раніцай 3 верасня ў Рагачове пачнуць сваю працу розныя тэматычныя пляцоўкі і выставы, у тым ліку «Геній зямлі беларускай» (да 125-годдзя Максіма Багдановіча), «Якуб Колас: жыццё і творчасць». Таксама пройдуць мерапрыемствы з нагоды 95-годдзя вядомага драматурга, ураджэнца Рагачова Андрэя Макаёнка, — адзначыў на сустрэчы з журналістамі **першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар ЛУЦКІ.** — Дзень 4 верасня пачнецца з пасадкі Саду малітвы, хрэснага ходу, святочнай літургіі ўдзельнікаў экспедыцыі «Дарога да святыняў».

СТАР. 2

■ Нерухомасць

## Суцэльная хваля «шэрых» агентаў

### Так званыя нелегальныя прадпрымальнікі ад нерухомасці занялі сёлета каля 20% другаснага рынку жылля ў Мінску

**Вольныя маклеры ўсё актыўней пашыраюць сваю прысутнасць на сталічным рынку жыллёвай нерухомасці, чым ствараюць сур'ёзную пагрозу для спажыўцоў, паведаміў старшыня савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» (БелАН) Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ падчас «круглага стала», дзе разглядаліся і праблемы будаўніцтва жылля ў Мінску.**

### Без ліцэнзіі

Наш пастаянны эксперт адзначыў, што ценявы сектар на рынку жылля галоўнага мегаполіса краіны пачаў істотна павялічваць сваю прысутнасць апошнія два гады. Росквіту нелегальнага сектара рыэлтарскіх паслуг спрыялі адразу некалькі асноўных фактараў. Па-першае, зніжэнне плацежаздольнасці кліентаў, бо жаданне сэканоміць заўсёды прысутнічала сярод насельніцтва, а таксама адсутнасць у агенцтваў гнуткіх тарыфаў на свае паслугі, дзе дзяржава не дазваляе выкарыстоўваць сістэму зніжак. «У адрозненне ад рыэлтарскіх арганізацый, дзейнасць якіх жорстка рэгулюецца Міністэрствам юстыцыі, «шэрымі» агентамі, якія працуюць без рэгістрацыі і ліцэнзіі, практычна ніхто не цікавіцца. У прыватнасці, сфера інтарэсаў Мінюста на іх не распаўсюджваецца, хоць іх актыўнасць на рынку стала заўважная кожнаму», — адзначыў старшыня савета.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!